УДК 070.1:631.6.02(476)(091)

**В. І. Канюта**
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

## «“ЗВЯЗДА” НА МЕЛІЯРАЦЫІ ПАЛЕССЯ»: ПЕРШАЕ РЭСПУБЛІКАНСКАЕ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЕ ЭКАЛАГІЧНАЕ ВЫДАННЕ БЕЛАРУСІ

У артыкуле абгрунтоўваецца роля сродкаў масавай інфармацыі ў захаванні экалагічнай бяспекі, вырашэнні праблем прыродакарыстання і выхаванні ў насельніцтва беражлівага стаўлення да прыроды. Упершыню прадметам навуковага аналізу стала гісторыя стварэння і дзейнасці рэспубліканскага грамадска-палітычнага экалагічнага выдання Беларусі «“Звязда” на меліярацыі Палесся», якое ў 1972–1990 гг. выходзіла на базе найстарэйшай штодзённай рэспубліканскай газеты «Звязда». Газета своечасова паведамляла аб падзеях, якія датычыліся меліярацыі і комплекснага асваення зямель Палесся, знаёміла грамадскасць з новаўвядзеннямі, фарміравала станоўчы вобраз меліярацыі як жыццёва неабходнага працэсу ў сучасным грамадстве. Вызначаюцца асаблівасці рэдакцыйнай працы, удакладняецца тэматыка і праблематыка, спецыфіка рубрыкацыі, жанравая палітра публікацый. Праведзены аналіз дае падставу называць газету «“Звязда” на меліярацыі Палесся» першым рэспубліканскім грамадска-палітычным экалагічным выданнем Беларусі. Рэгулярны зварот медыясупольнасці да тэмы беражлівых адносін да прыроды павышае ўзровень экалагічнай культуры насельніцтва. Гэтыя пытанні яшчэ больш актуалізуюцца ў сувязі з павелічэннем крызісных з’яў у экалагічнай сферы, паглыбленнем радыкальных уздзеянняў чалавека на прыроду, павышэннем рызыкі прыродных катаклізмаў і тэхнагенных катастроф. Традыцыі «“Звязды” на меліярацыі Палесся» ў сваёй рэдакцыйнай дзейнасці працягваюць многія сродкі масавай інфармацыі экалагічнай скіраванасці, якія выдаюцца ў Рэспубліцы Беларусь.

**Ключавыя словы:** журналістыка, сродкі масавай інфармацыі, экалагічная тэматыка, меліярацыя, «“Звязда” на меліярацыі Палесся».

**Для цытавання:** Канюта В. І. «“Звязда” на меліярацыі Палесся»: першае рэспубліканскае грамадска-палітычнае экалагічнае выданне Беларусі // Труды БГТУ. Сер. 4, Принт- и медиатехнологии. 2024. № 1 (279). С. 81–88.
DOI: 10.52065/2520-6729-2024-279-11.

**V. I. Kanyuta**
The Editorial and Publishing Institution “Publishing House “Zviazda”

## *“ZVIAZDA” NA MELIYARATSYI PALESSIA*: THE FIRST NATIONAL SOCIAL AND POLITICAL ENVIRONMENTAL JOURNAL OF BELARUS

The article substantiates the role of mass media in maintaining environmental security, solving natural resource management problems and cultivating environmental friendliness in people. The history of creation and activity of the national social and political environmental journal of Belarus *“Zviazda” na meliyaratsyi Palessia*, which was published on the basis of “Zviazda”, the oldest national daily newspaper, in 1972–1990, has become a subject of scientific analysis for the first time. The newspaper timely reported on events related to this sphere, introduced the public to innovations, formed a positive image of land reclamation as a vital process in modern society. The features of editorial work are determined, range of issues and themes, particular characteristics of editorial classification, the spectrum of publications genres are defined. The conducted analysis gives a reason to call the newspaper *“Zviazda” na meliyaratsyi Palessia* the first republican socio-political environmental publication of Belarus. Addressing the issue of environmental friendliness by the media community on a regular basis raises the level of environmental literacy among people. These issues are becoming more and more relevant owing to the increase of crisis phenomena in the environmental sphere, deepening of dramatic anthropogenic impact on nature, increasing risk of natural and man-made disasters. The traditions of *“Zviazda” na meliyaratsyi Palessia* in their editorial activity are continued by many ecologically oriented mass media published in the Republic of Belarus.

**Keywords:** journalism, mass media, environmental theme, land development, *"Zviazda" na meliyaratsyi Palessia.*

**For citation:** Kanyuta V. I. "*Zviazda" na meliyaratsyi Palessia*: the first national social and political environmental journal of Belarus. *Proceedings of BSTU, issue 4, Print- and Mediatechnologies*, 2024, no. 1 (279), pp. 81–88 (In Belarusian).

DOI: 10.52065/2520-6729-2024-279-11.

**Уводзіны.** Ахова навакольнага асяроддзя і экалагічная бяспека – сярод прыярытэтных кірункаў дзяржаўнай палітыкі Рэспублікі Беларусь. Ключавыя мэты ў галіне аховы навакольнага асяроддзя, асноўныя напрамкі дзейнасці, механізмы іх рэалізацыі і чакаемыя вынікі вызначаны Стратэгіяй у галіне аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь на перыяд да 2035 г., якая зацверджана 24 снежня 2021 г. загадам Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя [1]. Згодна з Пастановай Савета Міністраў ад 19 лютага 2021 г. № 99, дзейнічае Дзяржаўная праграма «Ахова навакольнага асяроддзя і ўстойлівае выкарыстанне прыродных рэсурсаў» на 2021–2025 гг. [2]. Пытанні забеспячэння экалагічнай і біялагічнай бяспекі знайшлі адлюстраванне ў праекце абноўленай Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь, адобранай Саветам бяспекі 6 сакавіка 2023 г. [3]. Сярод нацыянальных інтарэсаў у экалагічнай сферы – захаванне спрыяльнага навакольнага асяроддзя для жыццядзейнасці насельніцтва; пераадоленне негатыўных наступстваў радыёактыўнага забруджвання тэрыторыі краіны і іншых надзвычайных сітуацый, рэабілітацыя экалагічна парушаных тэрыторый; экалагічна арыентаванае сацыяльна-эканамічнае развіццё дзяржавы; рацыянальнае (устойлівае) выкарыстанне прыродна-рэсурснага патэнцыялу, а таксама захаванне біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці, экалагічнай раўнавагі прыродных сістэм; адаптацыя да змянення клімату. Нягледзячы на многія праблемы экалагічнага гучання, адной з актуальных застаецца тэма меліярацыі. Аб гэтым у тым ліку сведчыць і праведзеная 19 снежня 2023 г. кіраўніком дзяржавы нарада па пытаннях ажыццяўлення меліярацыі ў Рэспубліцы Беларусь.

**Асноўная частка.** На пленарным пасяджэнні Сусветнага саміту па барацьбе са змяненнем клімату, якое праходзіла 1 снежня 2023 г. у Дубаі (Аб'яднаныя Арабскія Эміраты), Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка назваў адной з першапрычын змянення клімату ваенныя канфлікты: «Войны з'яўляюцца галоўнай крыніцай бруду на нашым кантыненце. Гэта прага нажывы, якая ператварае прыродныя рэсурсы ў асабісты капітал і абкрадае будучыя пакаленні. Гэта спробы ўстараніць са свайго шляху краіны, якія перашкаджаюць падпарадкаваць увесь свет, і разбурыць, выцягнуўшы з зямлі ўсе сокі» [4].

У адпаведнасці з Парыжскім пагадненнем, Рэспубліка Беларусь у поўнай меры выконвае ўзятыя на сябе абавязацельствы і нават перавыконвае іх. «Мы аказваем бясцэнныя экасістэмныя паслугі нашаму кантыненту, захоўваючы ўнікальную крыніцу кіслароду – прыродныя балоты, лясы, лёгкія Еўропы, – удакладніў беларускі лідар. – Развіваем зялёную і атамную энергетыку, мінімізуючы рызыкі змянення клімату» [4]. Беларусь заклікала ўсіх узяць цяжар адказнасці за ўсе стагоддзі бяздумнага стаўлення да прыроды.

Канец XX – пачатак XXI ст. характарызуецца кардынальнымі трансфармацыямі, у тым ліку ў экалагічнай сферы. Самая буйная ў мінулым стагоддзі тэхнагенная катастрофа – аварыя на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі (ЧАЭС) – адбылася 26 красавіка 1986 г. у Кіеўскай вобласці (Украінская ССР), у 16 кіламетрах ад граніцы з Беларуссю. Яе наступствы ў большай ступені закранулі нашу краіну, што паўплывала на фарміраванне школы айчыннай экалагічнай журналістыкі. Аб гэтым сведчыць шырокі спектр спецыялізаваных перыядычных выданняў. Па стане на снежань 2023 г. інфармаванне насельніцтва аб пытаннях навакольнага асяроддзя ажыццяўляюць грамадска-палітычны, навукова-папулярны, ілюстраваны экалагічны часопіс «Родная прырода» (выданне выдавецкага дома «Звязда»), экалагічны дадатак да рэспубліканскай газеты «Звязда» «Карані і кроны», спецыялізаваны геалагічны часопіс «Літасфера» (выдавец – Інстытут геахіміі і геафізікі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і Беларускае геалагічнае таварыства), навуковы часопіс «Природные ресурсы» (выданне выдавецкага дома «Беларуская навука»). Акрамя таго, экалагічным праблемам прысвечаны некаторыя вузкаспецыялізаваныя навукова-тэхнічныя і навукова-аналітычныя выданні. Сярод іх – часопіс «Земляробства і ахова раслін», які выпускаецца рэспубліканскім навуковым даччыным унітарным прадпрыемствам «Інстытут абароны раслін», часопіс Гомельскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта «Проблемы здоровья и экологии», які спецыялізуецца на пытаннях медыцынскага і біялагічнага профілю. Аналагічныя часопісы на экалагічную тэматыку выдае і шэраг іншых вышэйшых навучальных устаноў краіны: «Журнал Белорусского государственного университета. Экология», «Веснік Брэсцкага ўніверсітэта. Серыя 5. Хімія, біялогія, навукі аб зямлі» і інш. У Нацыянальнай акадэміі

навук ствараецца часопіс «Весці НАН Беларусі. Серыя біялагічных навук», у якім сярод іншага даследуецца і экалагічная праблематыка. Асобна сярод экалагічных выданняў вылучаецца пінская газета «Живая вода». На яе старонках расказваецца аб рабоце меліяратыўных і рыбаводчых прадпрыемстваў краіны, спецыялістах, якія ўласным клопатам дбаюць аб урадлівых палетках і высокіх ураджаях, перадавых распрацоўках навукоўцаў, іх укараненні ў вытворчасць.

Пытанні аховы навакольнага асяроддзя рэгулярна ўздымаюцца на старонках грамадска-палітычных выданняў. Варта адзначыць, што публікацыі на экалагічную тэму змяшчаюцца не толькі ў рэспубліканскім друку. Дадзеная праблематыка хвалюе і чытачоў рэгіянальнай прэсы, дзе матэрыялы экалагічнай скіраванасці падаюцца ў спецыяльных рубрыках.

Своеасаблівы штуршок да маштабнага развіцця экалагічнай журналістыкі ў Беларусі быў звязаны з газетай «“Звязда” на меліярацыі Палесся», якая з’ўлялася органам ЦК КПБ, Вярхоўнага Савета і Савета Міністраў Беларускай ССР. Першы нумар газеты выйшаў 1 красавіка 1972 г. Гэта ўнікальны прыклад у гісторыі беларускай журналістыкі, калі на базе галоўнай грамадска-палітычнай газеты Беларусі «Звязда» пачало выходзіць рэспубліканскае грамадска-палітычнае экалагічнае выданне. Газета выдавалася на працягу 18 гадоў, спыніла выхад у снежні 1990 г. За гэты час выйшла 2910 нумароў.

Той факт, што дагэтуль выданне не стала прадметам навуковых вышукаў, перш за ўсё абумоўлены аварыяй на ЧАЭС, пра якую ішла размова вышэй: фокус увагі даследчыкаў сродкаў масавай інфармацыі, навукоўцаў-эколагаў быў засяроджны на вывучэнні наступстваў чарнобыльскай катастрофы. Тэма меліярацыі па аб’ектыўных прычынах адышла на другі план. Землі, якія павінны былі стаць меліяратыўнымі, пераўтварыліся ў чарнобыльскія – на гэтай тэрыторыі ў 1988 г. быў створаны Палескі дзяржаўны радыяцыйна-экалагічны запаведнік. Такім чынам, мы паспрабуем запоўніць гэты гісторыка-тэарэтычны прагал: «“Звязда” на меліярацыі Палесся» ўпершыню становіцца прадметам навуковага асэнсавання.

Варта ўзгадаць, што на некалькі месяцаў раней за «“Звязду” на меліярацыі Палесся», у студзені 1972 г., выйшаў часопіс «Родная прырода». Спачатку выдаваўся як бюлетэнь, затым – як ілюстраваны навукова-папулярны часопіс Дзяржаўнага камітэта БССР па ахове прыроды, прэзідыумаў рэспубліканскіх саветаў Беларускага таварыства аховы прыроды, Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў, Навуковага савета па праблемах біясферы Акадэміі навук БССР, Беларускага рэспубліканскага савета па турызме і экскурсіях. Са студзеня 2014 г. заснавальнікам сродку масавай інфармацыі, які рыхтуе выдавецкі дом «Звязда», з’яўляецца Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь. Раз на месяц грамадска-палітычны, навукова-папулярны, ілюстраваны экалагічны часопіс «Родная прырода» знаёміць чытачоў з інфармацыяй аб прыродным патэнцыяле Беларусі, дзяржаўнай палітыцы ў галіне аховы навакольнага асяроддзя і рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў, тэхналогіях і навацыях для вырашэння экалагічных праблем. На старонках выдання друкуюцца высокаякасныя фотаздымкі жывёльнага і раслiннага свету як прафесіяналаў, так і аматараў.

Сама назва «“Звязда” на меліярацыі Палесся» сведчыць, што газета адлюстроўвала спецыялізаваны тэматычны кірунак. У прыярытэце інфармацыйнай палітыкі выдання знаходзілася тэма меліярацыі забалочаных тэрыторый Беларусі. Дагэтуль спроба выпускаць СМІ падобнай праблематыкі ўжо была: Мінская балотная станцыя, якая вяла навуковую работу і ажыццяўляла метадычнае кіраўніцтва балотнай справай у Беларусі, з 1912 па 1917 гг. выдавала веснік «Болотоведение» [5]. Аднак гэта было вузкаспецыялізаванае выданне, разлічанае на нешырокае кола чытачоў.

«“Звязда” на меліярацыі Палесся» ўзнікла невыпадкова: у 1960–1980-х гг. меліярацыя з’яўлялася адным з найважнейшых кірункаў развіцця сельскай гаспадаркі ў БССР, у цэлым у Савецкім Саюзе. На меліяраваных землях ствараліся гарады і паселішчы, будаваліся дарогі, уведзеныя ў севазварот палі пачалі даваць добры ўраджай. У Беларусі меліярацыі надавалася асаблівая ўвага: дзейнічалі дзяржаўныя праграмы, планы па рэабілітацыі забалочаных земляў, напрыклад, Дзяржаўная праграма 1966 г. «Аб шырокім развіцці меліярацыі для атрымання высокіх устойлівых ураджаеў збожжавых і іншых культур». Меліярацыя дагэтуль з’яўляецца адным з прыярытэтных кірункаў развіцця аграпрамысловага сектара эканомікі краіны. Рэканструкцыя асушальных, асушальна-ўвільгатняльных і асноўных збудаванняў меліяратыўных і водагаспадарчых сістэм, а таксама іншыя мерапрыемствы па паляпшэнні ўрадлівасці земляў запланаваны падпраграмай «Развіццё меліярацыі земляў сельскагаспадарчага прызначэння» Дзяржаўнай праграмы «Аграрны бізнес» на 2021–2025 гг. [6]. Пытанні меліярацыі знаходзяцца на пастаянным кантролі ўрада, адпаведных ведамстваў.

Асаблівую ўвагу тэме меліярацыі ўдзяляе Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Лукашэнка. Пытанні асушэння балот і рацыянальнага выкарастыння

меліяраваных земляў рэгулярна ўзнімаюцца кіраўніком дзяржавы падчас рабочых паездак па краіне, спецыяльных нарад. У прыватнасці, 11 лістапада 2022 г. пад кіраўніцтвам А. Лукашэнкі ў Талачынскім раёне, на базе ААТ «Амкадор-КЭЗ», адбыўся семінар-нарада па пытаннях аднаўлення і выкарыстання меліяраваных земляў у рэспубліцы. Найважнейшае пытанне для развіцця сельскай гаспадаркі і экалогіі абмяркоўвалася дэталёва і на перспектыву. Прэзідэнтам было прынята рашэнне ўзмацняць меліярацыю. Як заўважыў кіраўнік дзяржавы, «пытанне быць ці не быць меліярацыі ў Беларусі нават не абмяркоўваецца. Маё найжорсткае патрабаванне застаецца ранейшым: кожны кавалак такой зямлі павінен быць выкарыстаны на карысць краіны» [7]. Аб эфектыўнасці дзяржаўнай падтрымкі сведчыць тое, што «ў папярэднюю пяцігодку дзякуючы праграме "Захаванне і выкарыстанне меліяраваных земляў" Дзяржпраграмы развіцця аграрнага бізнесу змаглі ўвесці ў севазварот 175 тысяч гектараў рэканструяваных меліярацыйных сістэм і зноў меліяраваных сельскагаспадарчых земляў» [8].

А пачыналася гэтая маштабная справа з газеты «"Звязда" на меліярацыі Палесся». У першым нумары паведамлялася: «Дарагія сябры! Сёння пошта прынесла вам новае перыядычнае выданне «"Звязда" на меліярацыі Палесся» – спецыяльны выпуск старэйшай рэспубліканскай газеты. Выпуск разлічаны на шырокае кола чытачоў і будзе выдавацца працяглы час. Перыядычнасць выхаду – тры разы на тыдзень. Выданне ставіць сваёй мэтай грунтоўна і ўсебакова асвятляць ход меліярацыйнага будаўніцтва на Палессі, стварэння новых гаспадарак на асушаных землях, прапагандаваць перадавы вопыт, ярка і ўсхвалявана расказваць пра энтузіястаў вялікай бітвы за абнаўленне і росквіт палескага краю. Спецвыпуск будзе таксама пільна трымаць на прыцэле недахопы і хібы ў правядзенні меліярацыйных работ, браць пад абстрэл безгаспадарчасць і марнатраўства, бракаробства і безадказнасць, актыўна змагацца за тое, каб меліярацыя зямель ажыццяўлялася на строга навуковай аснове, будаўніцтва вялося хутка і надзейна, а гідрамеліярацыйныя сістэмы былі даўгавечныя і эфектыўныя» [9].

Рэдакцыйная калегія прапанавала чытачам прымаць удзел у дзейнасці спецвыпуску – «пісаць пра свае працоўныя поспехі і планы, пра радасці і няўдачы, пра ўсё добрае, карыснае, а таксама пра тое, што вас засмучае, што перашкаджае плённай рабоце» [9]. Чытачы адгукнуліся на прапанову. Аналіз газетных падшывак сведчыць: прыкладна трэцяя частка публікацый кожнага спецвыпуску належыць пазаштатным карэспандэнтам. Рэгулярна аўтарамі публікацый выступалі актыўныя ўдзельнікі меліярацыі: дырэктары саўгасаў, інжынеры, брыгадзіры, механізатары і інш. З жанравага пункту гледжання яны аддавалі перавагу інтэрв'ю, артыкулу, карэспандэнцыі, справаздачы, фотанарысу. Шырокае прадстаўніцтва пазаштатных аўтараў у многіх рэгіёнах краіны дазваляе зрабіць выснову, што, нягледзячы на спецыялізацыю на вузкай тэме і геаграфічную прывязку да канкрэтнага рэгіёна, «"Звязду" на меліярацыі Палесся» чыталі ва ўсіх абласцях БССР. І ўсё ж, нягледзячы на вялікую колькасць пазаштатных аўтараў, актуальныя тэматычныя паведамленні БЕЛТА і ТАСС, што рэгулярна друкаваліся ў спецвыпуску, асноўны кантэнт «"Звязды" на меліярацыі Палесся» распрацоўваўся прафесійнымі («штатнымі») журналістамі.

Рэдакцыя газеты знаходзілася ў Пінску. У Салігорску і Калінкавічах былі арганізаваны карэспандэнцкія пункты. «"Звязда" на меліярацыі Палесся» прытрымлівалася заяўленай перыядычнасці і выходзіла па аўторках, чацвяргах і суботах. На чатырох палосах фармату А3 тры разы на тыдзень паведамлялася аб найважнейшых падзеях у краіне, якія датычыліся розных сфер дзейнасці. Не адыходзіла выданне і ад шырокай тэматычнай палітры, якую анансавала ў першым нумары. У дэбютным выпуску аўтары абяцалі публікаваць матэрыялы, якія раскажуць пра выкарыстанне асушаных і асвоеных зямель, пра барацьбу хлебаробаў за высокія ўраджаі на адваяванай у балот палескай цаліне, пра ўсё новае і цікавае, што нараджаецца ў працоўных буднях. Як і планавалася, друкаваліся ў «"Звяздзе" на меліярацыі Палесся» і матэрыялы на тэмы маралі, культуры і побыту, шырока паказвалася жыццё і праца савецкіх людзей.

Найбольшая колькасць публікацый прысвячалася цэнтральнай тэме – меліярацыі. У перадавым артыкуле «Ганаровая задача, вялікая адказнасць», які выйшаў 1 красавіка 1972 г., паведамлялася: «Асаблівае значэнне меліярацыя зямель на Палессі набыла пасля майскага (1966 г.) Пленума ЦК КПСС, на якім прынята рашэнне "Аб шырокім развіцці меліярацыі зямель для атрымання высокіх і ўстойлівых ураджаеў збожжавых і іншых сельскагаспадарчых культур". Рэзка павысіліся патрабаванні да тэхнічнага ўзроўню меліярацыі, яе комплекснасці» [10]. Мерапрыемствы па асушэнні балот у розных рэгіёнах краіны былі адлюстраваны ў рубрыцы «На меліярацыйных трасах». Як правіла, у публікацыях аўтары дзяліліся вынікамі зробленага, дасягненнямі канкрэтных людзей, якія мелі прамое дачыненне да меліярацыі. «Здаўна славіліся брылёўскія землі багатым ураджаем на яблыкі, – піша Р. Андрэявец у карэспандэнцыі "Слова справай моцнае". – Восенню ў магазінах горада і на шумным базары можна ўбачыць вялікія, крамяныя, налітыя сонцам яблыкі, якія выраслі на

гэтай зямлі. Але побач з гэтым квітнеючым краем садавіны, па другі бок шашы, як ні дзіўна, ужываліся балотцы, дзе густа рос высокі чарот. Ці то рукі не даходзілі да гэтых зямель, ці то ў гаспадарцы не хапала патрэбнай тэхнікі, каб асушыць іх, але да сёлетняй вясны тут расла толькі дзікая трава. <…> Былая забалочаная мясціна на вачах мяняе аблічча. А дапамагаюць ёй стаць больш прыгажэйшай, больш урадлівай меліяратары перасоўнай механізаванай калоны нумар 39, якая знаходзіцца ў Гомелі» [11]. У публікацыі «Тон задаюць маладыя» паведамляецца, што «камсамольска-маладзёжны ўчастак Ельскага будаўніча-мантажнага ўпраўлення, які ўзначальвае І. Гуня, быў створаны тры гады назад. За гэты невялікі адрэзак часу ў калектыве выраслі вопытныя спецыялісты меліярацыйных трас, энтузіясты сваёй справы. Розныя характары, розныя прафесіі ў гэтых людзей, але іх аб'ядноўвае адна мэта – пераўтварыць адвечныя балоты ва ўрадлівыя палеткі, каб былыя землі сталі жытніцай» [12].

Праблемы меліярацыі абмяркоўваліся і за «круглымі сталамі», якія рэгулярна праходзілі ў рэдакцыі. У выніку аднаго з іх выйшла публікацыя «Індустрыя меліяратараў Палесся: здабыткі і праблемы» [13]. У размове за «круглым сталом» закраналіся разнастайныя пытанні навукова-тэхнічнага прагрэсу ў меліярацыйным будаўніцтве, укаранення ў вытворчасць дасягненняў навукі і перадавога вопыту. У абмеркаванні на тэму, як вырашаецца задача паскарэння навукова-тэхнічнага прагрэсу, што робіцца для таго, каб дасягненні навукі і перадавы вопыт хутка ўкараняліся ў вытворчасць, прынялі ўдзел прадстаўнікі прадпрыемстваў, якія непасрэдна ўдзельнічалі ў меліярацыйных работах: кіраўнікі, інжынер, электраслесар, машыніст экскаватара. «Меліярацыя – гэта агульнадзяржаўная, усенародная справа, важнейшая ўмова інтэнсіфікацыі сельскай гаспадаркі, – робіць выснову журналіст, які праводзіў "круглы стол". – У складанай і шматграннай рабоце па пераўтварэнні забалочаных і пераўвільготненых зямель ва ўрадлівыя палі і сенажаці ўсё большае значэнне набывае індустрыялізацыя будаўніцтва, навукова-тэхнічны прагрэс. XXV з'езд КПСС паставіў перад меліяратарамі краіны надзвычай важную і адказную задачу: "Паскорыць укараненне дасягненняў навукі і тэхнікі ў меліярацыю, забяспечыць далейшую індустрыялізацыю водагаспадарчага будаўніцтва і эксплуатацыйных работ, прымяненне прагрэсіўнай тэхнікі паліву, аўтаматызацыю і механізацыю кіравання меліярацыйнымі сістэмамі"» [13].

У рубрыцы «Шляхамі Палесся» друкаваліся матэрыялы аб умовах, у якіх жывуць меліяратары, развіцці інфраструктуры побач з іх жыллём, паведамлялася аб тым, што створана для размяшчэння студэнцкіх атрадаў і інш. Яшчэ адна рубрыка, прысвечаная мерапрыемствам меліярацыі, – «Правяраем выкананне абавязацельстваў»: справаздачу давалі прадстаўнікі рэгіёнаў, дзе ажыццяўлялася меліярацыя (Любаншчына, Мазыршчына, Салігоршчына, Піншчына і інш.).

Не заставаліся па-за ўвагай журналістаў «"Звязды" на меліярацыі Палесся» і іншыя падзеі, якія адбываліся ў краіне, свеце. Так, рэгулярна паведамлялася аб навінах замежжа (рубрыка «За рубяжом»). З нумара ў нумар публікавалася інфармацыя аб буйных мерапрыемствах усесаюзнага значэння, друкаваліся выступленні кіраўніцтва СССР, Беларускай ССР. У матэрыялах закраналіся і пытанні адукацыі, навукі, тэхнікі, асвятлялася спартыўная тэматыка. Праблемы культуры ўздымаліся ў рэпартажах, рэцэнзіях, многія з якіх (асабліва на творы літаратуры) былі напісаны чытачамі. У газеце выходзіла літаратурная старонка, дзе друкаваліся вершы, апавяданні, гумарэскі. У некалькіх нумарах па частках быў апублікаваны ўрывак з другой главы рамана Івана Мележа «Людзі на балоце». У 1972 г., калі пачала выходзіць «"Звязда" на меліярацыі Палесся», вядомаму беларускаму пісьменніку за раманы «Людзі на балоце» і «Подых навальніцы» была прысуджана Ленінская прэмія. Выдадзены ў 1962 г. раман аб жыцці вёскі, якая размясцілася сярод палескіх балот, арганічна ўпісаўся ў змест «"Звязды" на меліярацыі Палесся».

Акрамя праблем меліярацыі, газета рэгулярна звярталася да іншых тэм, якія хвалявалі тагачаснае грамадства. Напрыклад, асвятляліся пытанні адтоку моладзі з сельскай мясцовасці, недахопу кваліфікаваных кадраў. Не прапусціла газета і такую важную падзею, як летнія Алімпійскія гульні XXII, якія ў 1980 г. праводзіліся ў Савецкім Саюзе. Святочныя дні таксама не былі абдзелены ўвагай журналістаў. Аднак нават у навагодніх нумарах акцэнты зроблены на меліярацыйнай тэматыцы.

У ходзе дадзенага даследавання аўтарам быў праведзены шэраг эксклюзіўных інтэрв'ю з медыяэкспертамі, у тым ліку з фотакарэспандэнтам газеты «"Звязда" на меліярацыі Палесся» (з 1972 па 1990 гг.) Яўгенам Пясецкім. Ён падкрэсліў, што працаваць у спецвыпуску «Звязды» лічылася прэстыжным. Паводле яго ўспамінаў, рыхтаваць фотарэпартажы з перасоўнай механізаванай калоны (ПМК) ці з новабудоўлі, новай гаспадаркі, якая стваралася на гэтых землях, было заданнем нумар адзін. Многія з супрацоўнікаў экалагічнай газеты з'яўляліся штатнымі аўтарамі «Звязды». Аднак для «"Звязды" на меліярацыі Палесся» яны стваралі ўнікальны кантэнт. Экспертнае меркаванне супрацоўніка экалагічнага выдання Я. Пясецкага сведчыць аб папулярнасці «"Звязды" на меліярацыі Палесся» ў тагачасным грамадстве, адметнасці друкаванага выдання ў сістэме сродкаў масавай інфармацыі.

Ён адзначае, што супрацоўнікі «Звязды» не аддзялялі «"Звязду" на меліярацыі Палесся» ад асноўнага выдання. Мясцовыя журналісты, жыхары Пінска, падтрымлівалі з імі сувязь па пошце, тэлефоне. «І калі мінскія журналісты не ўсе пытанні маглі асвяціць, то мясцовыя журналісты выконвалі пастаўленыя задачы больш плённа: яны больш ведалі тэматыку, бачылі, як ідуць справы. Яны былі на пярэднім краі» [14].

Структурна «"Звязда" на меліярацыі Палесся» была падзелена на галіновыя кірункі. У рэдакцыі былі створаны аддзелы культуры, пісьмаў, прамысловасці, сельскай гаспадаркі. Спецыяльнага аддзела, які б займаўся тэмай меліярацыі, не было: кожнае падраздзяленне працавала на гэтую тэматыку. У асноўным у асвятленні пытанняў меліярацыі былі задзейнічаны журналісты аддзелаў сельскай гаспадаркі і прамысловасці, агітацыі і прапаганды. Гэтыя людзі выязджалі ў розныя раёны Беларусі, дзе знаходзіліся меліяратыўныя аб'екты. У выніку атрымліваліся матэрыялы і для «Звязды», і для «"Звязды" на меліярацыі Палесся». Тэматыка меліярацыі Палесся ў асноўнай газеце – «Звяздзе» – была амаль кожны дзень. У рэспубліканскім штодзённым выданні яе курыраваў намеснік рэдактара газеты В. Мікалаенка, які выдатна ведаў гэтую тэму, увогуле праблематыку сельскай гаспадаркі. Адказваў за асвятленне меліярацыі і загадчык аддзела сельскай гаспадаркі А. Кукарэка – чалавек вядомы ў галіне сельскай журналістыкі. Яны трымалі сувязь з Пінскам і перадавалі заданні супрацоўнікам аддзела, якія цікавіліся гэтай тэматыкай. У камандзіроўкі супрацоўнікі «"Звязды" на меліярацыі Палесся» з'язджалі дастаткова часта. Як правіла, гэта былі населеныя пункты, у тым ліку новыя, якія абжываліся меліяратарамі і механізатарамі. Як адзначае Я. Пясецкі, журналістам было цікава асвятляць гэтую тэму: «Мы ведалі, што і тэматыка адказная, і аб'ект цікавы – прыязджаеш туды і бачыш тое, чаго раней не бачыў. Тыя, хто прыязджаў на Палессе пісаць або фатаграфаваць, дзівіліся, самі спасцігалі, дазнаваліся, што гэта, як выглядае, у чым сэнс механізмаў. Безумоўна, цікава было мець зносіны і з людзьмі, якія працавалі з такімі механізмамі. Гэтыя аб'екты з'яўляліся адказнымі для рэспублікі, а таму людзі, якія там працавалі, знаходзіліся пад пільным вокам дзяржаўнай прапаганды і агітацыі. Калі сапраўды чалавек вызначаўся працай ці сваімі рацыяналізатарскімі пошукамі, яго партрэты абавязкова змяшчаліся ў газетах і часопісах, аб яго дасягненнях паведамлялі па радыё, аб ім здымалі кінафільмы, гэты спецыяліст атрымліваў заслужаныя ўзнагароды. Мы ведалі, калі ехалі ў камандзіроўку, што на гэтым полі працуе, дапусцім, Герой Сацыялістычнай Працы. Такіх прыкладаў па іншых рэгіёнах рэспублікі не было: каб ехаў і ведаў, што некалькі тыдняў таму чалавек атрымаў ордэн Леніна, а на іншым полі – ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга. Па тым часе машыніст шматкаўшовага экскаватара быў як пілот сучаснага рэактыўнага самалёта» [14].

Цікавасць да газеты ў чытацкай аўдыторыі пастаянна расла. Для мясцовых жыхароў рэспубліканская «Звязда» была нават менш вядомая, чым экалагічнае выданне. Тыраж «"Звязды" на меліярацыі Палесся» мяняўся: у пачатку свайго існавання газета выходзіла колькасцю ў амаль 12 тысяч экзэмпляраў, а на завяршэнні яе выдавецкай дзейнасці – крыху больш за 5 тысяч экзэмпляраў. Апошні нумар (2910) «"Звязды" на меліярацыі Палесся» ўбачыў свет 29 снежня 1990 года. Гэты выпуск нічым не адрозніваўся ад папярэдніх. Не было ніякіх паведамленняў аб тым, што грамадска-палітычная газета экалагічнай тэматыкі спыняе выхад. З вышыні часу можна зрабіць выснову: асноўная ўвага тагачасных сродкаў масавай інфармацыі была скіравана на асвятленне постчарнобыльскай праблематыкі, наступствы барацьбы з негатыўнымі з'явамі, якія назіраліся ў выніку тэхнагеннай катастрофы. Як слушна заўважае Т. Падаляк, перад СМІ стаялі новыя задачы – «адэкватнае адлюстраванне постчарнобыльскай праблематыкі, асвятленне ўсіх падзей на падставе збалансаванага падыходу, строгай узважанасці ў адборы, падачы і інтэрпрэтацыі фактаў, захаванне медыяэкаэтыкі, якая ў XXI ст. разглядаецца як адзін з найважнейшых трэндаў сучаснай журналістыкі» [15, с. 207].

**Заключэнне.** За сваю амаль 20-гадовую выдавецкую дзейнасць «"Звязда" на меліярацыі Палесся» ўнесла важкі ўклад у аператыўнае і якаснае інфармаванне насельніцтва аб меліярацыі і комплексным асваенні зямель Палесся. Газета своечасова паведамляла аб падзеях, якія датычыліся гэтай сферы, знаёміла грамадскасць з новаўвядзеннямі, фарміравала станоўчы вобраз меліярацыі як жыццёва неабходнага працэсу ў сучасным грамадстве. Нягледзячы на прыярытэтную тэматычную скіраванасць, выданне асвятляла шырокі спектр актуальнай праблематыкі, таму варта аднесці «"Звязду" на меліярацыі Палесся» не да вузкаспецыялізаванага сродку масавай інфармацыі, а да паўнавартаснай газеты з экалагічным ухілам. Праведзены аналіз дае падставу называць газету «"Звязда" на меліярацыі Палесся» першым рэспубліканскім грамадска-палітычным экалагічным выданнем Беларусі. Тэма экалогіі па-ранейшаму з'яўляецца актуальнай для айчынных СМІ. Традыцыі «"Звязды" на меліярацыі Палесся» ў сваёй рэдакцыйнай дзейнасці працягваюць многія сродкі масавай інфармацыі экалагічнай скіраванасці, якія выдаюцца ў Рэспубліцы Беларусь.

## Спіс літаратуры

1. Стратегия в области охраны окружающей среды Республики Беларусь на период до 2035 года // Официальный сайт Министерства природных ресурсов и охраны окружающей среды Республики Беларусь. URL: https://minpriroda.gov.by/uploads/files/strategija-oxr.okr.sredy-do-2035g.pdf (дата обращения: 08.12.2023).
2. Охрана окружающей среды и устойчивое использование природных ресурсов. Что включено в госпрограмму до 2025 года? // Национальный правовой интернет-портал Республики Беларусь. URL: https://pravo.by/novosti/novosti-pravo-by/2021/february/59970/ (дата обращения: 08.12.2023).
3. Постановление Совета безопасности Республики Беларусь о рассмотрении проекта новой Концепции национальной безопасности Республики Беларусь // Национальный правовой интернет-портал Республики Беларусь. URL: https://pravo.by/document/?guid=3871&p0=P223s0001 (дата обращения: 08.12.2023).
4. Удзел у Сусветным саміце па барацьбе са змяненнем клімату // Афіцыйны інтэрнэт-партал Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. URL: https://president.gov.by/be/events/uchastie-v-vsemirnom-sammite-po-borbe-s-izmeneniem-klimata-1701434864 (дата звароту: 08.12.2023).
5. Улитенок Г. В поисках утраченного. Из истории гидромелиорации белорусского Полесья // Портал Беларусь Сегодня. URL: https://www.sb.by/articles/delo-pervostepennoy-vazhnosti-.html (дата обращения: 16.12.2023).
6. О Государственной программе «Аграрный бизнес» на 2021–2025 годы: постановление Совета Министров Респ. Беларусь, 1 февр. 2021 г., № 59 // Национальный правовой интернет-портал Республики Беларусь. URL: https://pravo.by/document/?guid=3871&p0=C22100059 (дата обращения: 08.10.2023).
7. Канюта В. «Кожны кавалак такой зямлі павінен быць выкарыстаны на карысць краіны» // Звязда. 2022. 12 ліст. С. 1–2.
8. Веселуха Е. В чем особенность мелиорации 2023 года и на какие объекты будет распределено госфинансирование // Портал Беларусь Сегодня. URL: https://www.sb.by/articles/meliorirovannye-gektary-dlya-bolshogo-urozhaya.html (дата обращения: 16.12.2023).
9. Слова да чытачоў // «Звязда» на меліярацыі Палесся. 1972. 1 крас. С. 1.
10. Ганаровая задача, вялікая адказнасць // «Звязда» на меліярацыі Палесся. 1972. 1 крас. С. 1.
11. Андрэявец Р. Слова справай моцнае //«Звязда» на меліярацыі Палесся. 1976. 3 чэрв. С. 3.
12. Паўлаў Д. Тон задаюць маладыя //«Звязда» на меліярацыі Палесся. 1976. 18 ліст. С. 1.
13. Тарасевіч В. Індустрыя меліяратараў Палесся: здабыткі і праблемы // «Звязда» на меліярацыі Палесся. 1976. 8 крас. С. 3.
14. Канюта В. Як «Звязда» адраджала Палессе // Звязда. 2023. 9 жн. С. 12–13.
15. Падаляк Т. У. Аксіялогія сучаснай беларускай журналістыкі. Мінск: БДУ, 2016. 263 с.

## References

1. Environmental protection strategy of the Republic of Belarus for the period up to 2035. Available at: https://minpriroda.gov.by/uploads/files/strategija-oxr.okr.sredy-do-2035g.pdf (accessed 08.12.2023) (In Russian).
2. Environmental protection and sustainable use of natural resources. What does the state program up to 2025 include? Available at: https://pravo.by/novosti/novosti-pravo-by/2021/february/59970/ (accessed 08.12.2023) (In Russian).
3. Resolution of the Security Council of the Republic of Belarus on review of the draft of a new national security Concept of the Republic of Belarus. Available at: https://pravo.by/document/?guid=3871&p0=P223s0001 (accessed 08.12.2023) (In Russian).
4. Participation in the United Nations Climate Change Conference. Available at: https://president.gov.by/be/events/uchastie-v-vsemirnom-sammite-po-borbe-s-izmeneniem-klimata-1701434864 (accessed 08.12.2023) (In Belarusian).
5. Ulitenok G. In search of the lost. From history of hydromelioration of the Belarusian Polesye. Available at: https://www.sb.by/articles/delo-pervostepennoy-vazhnosti-.html (accessed 16.12.2023) (In Russian).
6. On the State Program Agricultural Business for 2021-2025: Resolution of the Council of Ministers of the Republic of Belarus No. 59, February 1, 2021. Available at: https://pravo.by/document/?guid=3871&p0=C22100059 (accessed 08.10.2023) (In Russian).
7. Kanyuta V. Every inch of such land should be used for the benefit of the country. *Zviazda* [Star], 2022, November 12, pp. 1–2 (In Belarusian).
8. Veselukha E. What is the feature of land development in 2023 and what facilities will be state-funded. Available at: https://www.sb.by/articles/meliorirovannye-gektary-dlya-bolshogo-urozhaya.html (accessed 16.12.2023) (In Russian).

9. A word to the readers. *"Zviazda" na meliyaratsyi Palessia* ["Zvyazda" at the Polesye land reclamation site], 1972, April 1, p. 1 (In Belarusian).

10. An honorable task, a big responsibility. *"Zviazda" na meliyaratsyi Palessia* ["Zvyazda" at the Polesye land reclamation site], 1972, April 1, p. 1 (In Belarusian).

11. Andreyevets R. Words are backed up by deeds. *"Zviazda" na meliyaratsyi Palessia* ["Zvyazda" at the Polesye land reclamation site], 1976, June 3, p. 3 (In Belarusian).

12. Pavlov D. The youth sets the tone. *"Zviazda" na meliyaratsyi Palessia* ["Zvyazda" at the Polesye land reclamation site], 1976, November 18, p. 1 (In Belarusian).

13. Tarasevich V. Polesye' land developers' industry: Resources and problems. *"Zviazda" na meliyaratsyi Palessia* ["Zvyazda" at the Polesye land reclamation site], 1976, April 8, p. 3 (In Belarusian).

14. Kanyuta V. How Zviazda revived Polesye. *Zviazda* [Star], 2023, August 9, p. 12–13 (In Belarusian).

15. Podolyak T. V. *Aksiyalogiya suchasnay belaruskay zhurnalistyki* [Axiology of modern Belarusian journalism]. Minsk, BSU Publ., 2016, 263 p. (In Belarusian).

## Інфармацыя пра аўтара

**Канюта Вераніка Іванаўна** – магістр, аспірант (саіскальніцтва) кафедры медыялогіі. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (220030, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 4, Рэспубліка Беларусь); рэдактар аддзела палітыкі. Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда» (220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, Рэспубліка Беларусь). E-mail: veronika_kanyuta@mail.ru

## Information about the author

**Kanyuta Veranika Ivanauna** – Master, PhD student (External doctorate student), the Department of Medialogy. Belarusian State University (4, Nezavisimosti Ave., 220030, Minsk, Republic of Belarus); editor of the politics office. The Editorial and Publishing Institution "Publishing House "Zviazda" (10a, B. Khmelnitsky str., 220013, Minsk, Republic of Belarus). E-mail: veronika_kanyuta@mail.ru

*Паступіў 26.12.2023*